ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
ГОСУДАРСТВЕННАЯ РЕГИСТРАЦИЯ
Регистрационный номер 400469580
03.01.2024 Кравцов А.Г.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загадам начальніка галоўнага ўпраўлення адукацыі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта
«28» 12 2023 г. № 931

ЗМЯНЕННІ І ДАПАЎНЕННІ
ў Статут дзяржаўнай установы адукацыі «Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі», зарэгістраванай ў Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў за № 400469580

1. Пункт 1 Статута дапоўніць трэцім абзацам:

«Рашэннем Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта ад 30 кастрычніка 2023 года № 860 дзяржаўная ўстанова адукацыі «Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі» рэарганізаваны шляхам далучэння да яе ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны абласны вучэбна-метадычны цэнтр прафесійнай адукацыі». Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі» з'яўляецца правапераемнікам правоў і абавязкаў установы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны абласны вучэбна-метадычны цэнтр прафесійнай адукацыі».

2. У пункце 6 Статута замяніць дату і нумар «28 ліпеня 2011 г. № 198» на «10 кастрычніка 2022 г. № 379».

3. У пункце 39 Статута замяніць дату і нумар «28 ліпеня 2011 г. № 198» на «10 кастрычніка 2022 г. № 379».

4. У пункце 45 Статута:

у абзацы другім замяніць слова «калегіяльным» на слова «асноўным»;

у абзацы чацвёртым пасля першага сказа дадаць:

«Прадстаўнікі навучэнцаў абіраюцца адкрытым або таемным галасаваннем у навучальных групах, прадстаўнікі кіраўнікоў структурных падраздзяленняў, педагагічных і іншых работнікаў установы абіраюцца адкрытым або таемным галасаваннем у структурных падраздзяленнях, прадстаўнікі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, іншых дзяржаўных органаў, арганізацый-заказчыкаў кадраў, грамадскіх аб'яднанняў, іншых арганізацый уключаюцца ў склад Савета на падставе прапаноў кіраўнікоў названых органаў і арганізацый».